## 53. Духоўнае сталенне Стася. Вобраз апавядальніка ў творы Генрыха Далідовіча “Страта”

**Мэты і задачы ўрока:** вылучыць эпізоды, важныя для характарыстыкі персанажаў, назіраць за маральным сталеннем Стася, яго высілкамі для самаўдасканалення; прааналізаваць будову твора, асобу аўтара-апавядальніка; спрыяць развіццю вуснага маўлення, фарміраванню камунікатыўнай культуры; садзейнічаць выхаванню умення сябраваць, шанаваць сапраўдную дружбу.

**Тып урока** — урок камбінаванай будовы.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік «Беларуская літаратура. 5 клас»; прыказкі і выказванні пра сяброўства, выстава малюнкаў вучняў.

**Эпіграфы да ўрока**

*«Дружба мацней за каменныя сцены»*

*«Чалавек без сябра што ежа без солі»*

*«Прыяцеля за грошы не купіш»*

*«Прыяцеля пазнаеш у няшчасці»*

*«Шукай сабе сябра ў бядзе»*

*«І службу служы, і сябру дапамажы»*

*«Не ў службу, а ў дружбу»*

Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Праверка дамашняга задання**

—Запіс на дошцы лепшых назваў частак твора.

—Заслухоўванне вуснага паведамлення пра ўзаемаадносіны Стася і Міці Бокуця (2–3 вучні).

—Вуснае сачыненне-мініяцюру па народным выслоўем «Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам» (2–3 вучні).

—Запіс на дошцы слоў-асацыяцый да паняцця «сапраўдны сябар».

**3. Паведамленне тэмы, вызначэнне мэт і задач урока**

Сёння мы звамі працягнем вывучаць апавяданне ГенрыхаДалідовіча “Страта”, паспрабуем вызначыць змены ў характары Стася. Звярніце, калі ласка, увагу на дошку і па ланцужку прачытайце прыказкі і прымаўкі, змешчаныя на ёй. Паразважайце, як яны стасуюццадатэмы нашага ўрока.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**4. Вывучэнне новага матэрыялу**

**Складанне плана апавядання на аснове назваў частак твора**

*Прыклады планаў:*

| |
|---|
| 1. У вёсцы навіна.<br>2. Захапленне футболам.<br>3. Выпадак на ўроку матэматыкі.<br>4. Заняткі хлопчыкаў.<br>5. Шчырае сяброўства.<br>6. Заўчасная смерць. |

| |
|---|
| 1. “Бокуці прыехалі ў нашу вёску ўвосень…”.<br>2. “У вольны час мы любілі гуляць у футбол”.<br>3. “Міцеў цяжкі сакрэт…”.<br>4. “Цікавае ёсць і паблізу нас…”.<br>5. “У яго гэтулькі дабрыні, шчырасці…”.<br>6. “Самы лепшы і надзейны таварыш…”. |

| |
|---|
| 1. Навічок.<br>2. Захапленне футболам.<br>3. Міцеў сакрэт.<br>4. Заняткі хлопцаў.<br>5. Міцю пагоршала.<br>6. Памяць пра сябра. |

**Гутарка па пытаннях, выкананне заданняў**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Растлумачце думкі Стасіка: “Я, канечне, не ўсё разумеў, не так глыбока адчуваў Міцева няшчасце, як яго бацькі, але сваім дзіцячым сэрцам разумеў : не буду злы, няшчыры ці помслівы да Міці. Нейкая незразумелая мне самому пяшчота да хворага навічка агарнула маю душу, здаецца, напоўніла яе нечым новым, больш змястоўным”.

2. Ці зрабіла хвароба Міцю злым і сумным?

3. Чаму, на вашу думку, Стась лічыў Міцю самым лепшым і надзейным сябрам?

4. Як Міцева маці ставілася да Стася? Зачытайце адпаведныя радкі з твора.

5. Растлумачце думкі Стасіка: “Расчулены словамі, а найбольш тым, чаго недагаварыла Міцева маці, а таксама яе болем, я пабег у зімовы цёмны вечар, адчуваючы, што нешта мяняецца і мяняецца ў маёй душы, прыходзіць тое, чаго я раней ці не ведаў, ці ведаў не ў такой меры”.

6. Што мянялася ў душы Стасіка і чаму?

7. Што адчуваў Стась пры развітанні з сябрам? Чаму на ўсё жыццё Міця застаўся для яго “самым лепшым і надзейным таварышам”?

8. Якім быў фінал дружбы? Чаму Міця завяшчае свае любімыя рэчы Стасіку?

9. Як вы зразумелі сэнс назвы твора? Што азначае гэтае слова “страта” для Стася? Складзіце алфавіт

С –

Т –

Р –

А –

Т –

А –

10. У якой частцы, на вашу думку, заключана галоўная думка апавядання? Зачытайце ўрывак з яе (с. 85–86).

11. Ад імя якой асобы вядзецца апавяданне ў творы?

12. Якім вам уяўляецца аўтар-апавядальнік? Колькі гэтаму чалавеку гадоў? Якімі рысамі характару, на ваш погляд, валодае аўтар-апавядальнік?

13. Што цэніць у жыцці чалавек, ад імя якога напісаны твор?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Падагульненне**

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на дошку, дзе запісаны прыказкі, выразна чытае іх і просіць выбраць тую, якая, на погляд вучняў, лепш раскрывае сэнс апавядання «Страта» і растлумачыць свой выбар.

**7. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак**

**8. Рэфлексія**

Працягніце фразы:

Сапраўдны сябар – той, хто...

Я хачу мець сапраўднага сябра, таму што…

**9. Інфармацыя пра дамашняе заданне і інструктаж па яго выкананні**

1. Падрыхтаваць сціслы пераказ кожнай часткі твора.

2. Падрыхтаваць вуснае сачыненне-разважанне на тэму «Сапраўдныя сябры. Якія яны?».

3. Скласці кадраплан апавядання Генрыха Далідовіча «Страта». У працэсе работы над кадрапланам можна выкарыстаць наступную табліцу:

| **Сцэна і яе загаловак** | **Персанажы і адносіны паміж імі** | **Дзеянні, рухі персанажаў** | **Пейзажны фон** | **Музычнае афармленне ці цытаты з тэксту** |
|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | |
| 2. | | | | |
| 3. | | | | |
| 4. | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ